**КАЛЯДА** Андрэй Андрэевіч [нар. 3. 06. 1940, в. Панямонь Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.] – беларускі тэатральны педагог. Кандыдат педагагічных навук (1975). Прафесар (1993).

Скончыў СШ № 1 г. Навагрудка (1957). У 1958–1962 гг. вучыўся на акцёрскім факультэце Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Працаваў акцёрам Беларускага тэатра імя Я. Купалы (1962–1966). У 1966–1989 гг. працуе на кафедры беларускага мовазнаўства і беларускай літаратуры Мінскага педінстытута імя М. Горкага. З 1989 г. працуе прарэктарам па вучэбнай рабоце Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (акадэміі мастацтваў), вядзе курс “Акцёр драматычнага тэатра, кіно, чытальнік”. У 1966–1995 гг. быў мастацкім кіраўніком тэатра чытальнікаў “Жывое слова” (з 1977 г. званне “народнага”). Друкавацца пачаў у 1967 г. Аўтар шматлікіх публікацый па тэорыі і методыцы выразнага чытання. Аўтар метадычных і вучэбных дапаможнікаў: “Выразнае чытанне” (1970, 3-е выд. 1989), “Выразнае чытанне сатырычных вершаў, баек і драматычных твораў” (1973), “Расказванне і чытанне ў дзіцячым садзе” (1978), “Выразнае чытанне. IV – VII класы” (1982), “Слоўнік акцёра і рэжысёра” (1995). Перакладчык літаратурных твораў з рускай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ